# ЗНАХОДКІ НАКАНЕЧНІКАЎ СТРЭЛ ПАЎНОЧНАЕЎРАПЕЙСКІХ ТЫПАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

***У. А. Плавінскі***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь*

У комплексе прадметаў узбраення на тэрыторыі Беларусі вылучаецца зброя паўночнаеўрапейскага паходжання. Найбольш шырока ў гэтым комплексе прадстаўлены наканечнікі стрэл ланцэтападобнай формы.

Да нядаўняга часу ланцэтападобныя стрэлы з тэрыторыі Беларусі не станавіліся прадметам асобнага даследавання. У кантэксце публікацый матэрыялаў помнікаў асаблівая ўвага нададзена знаходкам наканечнікаў з Пруднікаў [1, с. 217–225], Лукомля [2, с. 110–135], Кульбачына [3, с. 190–202]. Металаграфічны аналіз 2-х стрэл быў праведзены М. Ф. Гурыным [4, с. 74–75; 2, с. 100]. Частка наканечнікаў з тэрыторыі Беларусі трапіла ў картаграфічны каталог ланцэтападобных стрэл з тэрыторыі Старажытнай Русі С. Ю. Каінава [5, мал. 7]. У апошні час да знаходак падобных стрэл звяртаўся С. Дз. Дзярновіч. У яго каталог паўночнаеўрапейскіх старажытнасцяў з тэрыторыі Беларусі трапілі 57 наканечнікаў [6, с. 58–60]. Прапанаваны артыкул мае на мэце абагульніць вядомыя на дадзены момант знаходкі.

Усяго на дадзены момант вядома не менш за 99 знаходак ланцэтападобных наканечнікаў стрэл.

Для пачатку разгледзім тыпалагічную прыналежнасць артэфактаў. У адпаведнасці з класічнай тыпалогіяй А. Ф. Мядзведзева [7] да ланцэтападобных наканечнікаў можна аднесці чатыры тыпы – тып 62 (які ўваходзіць у аддзел плоскіх наканечнікаў) і тыпы 75, 77, 78 (якія ўваходзяць у аддзел гранёных наканечнікаў).



*Мал. 1.* Ланцэтападобныя наканечнікі стрэл тыпу 62 з тэрыторыі Беларусі

1 – Полацк, Верхні Замак [8, мал. 30:1], 2, 3 – Віцебск, НіжніЗамак [9, мал. 45:5], 4 – гарадзішча Франопаль [10, мал. 1:6], 5–7 – гарадзішча Кульбачына [11, с. 31].

**Тып 62. Ланцэтападобныя плоскія** (79 экз., Мал. 1, 2, 3).

Вылучаецца два варыянты тыпу, якія адрозніваюцца паміж сабой наяўнасцю ўпора [7, с. 73]. Усяго на тэрыторыі Беларусі налічваецца не менш 79 экзэмпляраў.

Да першага варыянту тыпу адносіцца ўсяго адзін наканечнік з тэрыторыі Беларусі (Мал 1: 1), знойдзены падчас раскопак Г. В. Штыхава на Верхнім замку ў Полацку ў 1965 г. [7, мал. 30:1].

Усе астатнія экзэмпляры адносяцца да другога варыянту.

Найбольшая колькасць наканечнікаў тыпу 62:2 знойдзена на тэрыторыі Беларускага Падзвіння. Два экзэмпляры паходзяць з тэрыторыі Ніжняга Замка ў Віцебску [8, мал 45:5; 6, мал 385:5]. Два наканечніка знойдзены ў пластах гарадзішча Кастрыца Лепельскага р-на Віцебскай вобласці [12, мал 34:5]. Адзін з іх захаваўся ў выглядзе фрагмента пяра даўжынёй 59 мм. Верагодна, у цэлым выглядзе даўжыня наканечніка складала прыкладна 110 мм. Напластаванні гарадзішча ўтрымліваюць матэрыялы ад днепра-дзвінскай культуры да старажытнарускай эпохі.

Найбольш цікавыя і шматлікія наканечнікі стрэл, якія паходзяць з археалагічных комплексаў Лукомль Чашніцкага р-на і Пруднікі Міёрскага р-на Віцебскай вобласці.

У напластаваннях археалагічнага комплексу Лукомль знойдзена 13 плоскіх ланцэтападобных стрэл (Мал. 2). Частка з іх паходзіць з раскопаў, якія закранаюць абарончыя збудаванні гарадзішча. З 13 стрэл 11 адзінак маюць значныя дэфармацыі пяра і чарашка, верагодна, атрыманыя ў выніку непасрэднага іх выкарыстання, альбо іншага кантакту з цвёрдай паверхняй [2, с. 111].




*Мал. 2.* Ланцэтападобныя наканечнікі стрэл тыпу 62 з археалагічнага комплекса Лукомль

малюнак аўтара

Самая значная калекцыя стрэл тыпу 62:2 паходзіць з напластаванняў археалагічнага комплексу Пруднікі – 30 адзінак. Наканечнікі маюць наступныя сярэднія памеры: агульная даўжыня – 80–125 мм, даўжыня пяра – 60–90 мм, шырыня пяра – 8–15 мм, даўжыня чарашка – 12–25 мм (Мал. 3). Пры гэтым абсалютная большасць разглядаемых стрэл у сваёй даўжыні пераўзыходзіць 90 мм, толькі 5 асобнікаў карацей. 22 наканечнікі паходзяць з гарадзішча, 8 – з селішча. Металаграфічны аналіз адной стрэлы быў зроблены М. Ф. Гурыным. Наканечнік выраблены з крычнага жалеза з невялікай колькасцю вугляроду [4, с. 74].

Ланцэтападобным наканечнікам тыпу 62:2 прынята лічыць у літаратуры, экзэмпляр з паселішча Свіла-1 Глыбоцкага р-на Віцебскай вобласці [13, мал1:3]. Наканечнік знойдзены ў запаўненні гаспадарчай ямы, якая змяшчае ляпную кераміку (верагодна, фрагменты аднойпасудзіны).

З тэрыторыі гарадзішча Кульбачына Шчучынскага р-на Гродзенскай вобласці паходзяць 13 стрэл (Мал. 1: 5, 7). Іх даўжыня – 117–142 мм, даўжыня пяра – 90–122 мм. Найбольшая шырыня пяра – 14 мм, даўжыня чарашка – 19–25 мм. Знойдзены яны ў пластах другой паловы X – пач. XI ст. Сярод сінхронных прадметаў ўзбраення на гарадзішчы адзначаны 2 дзіды тыпу Е па Петэрсану [11, мал. 1: 5–7; 18, с. 12]. Акрамя ланцэтападобных стрэл, знойдзены 3 наканечнікі тыпу 41 X–XI стст., а таксама каля 10 наканечнікаў стрэл розных тыпаў X–XIII стст.




*Мал. 3.* Ланцэтападобныя наканечнікі стрэл тыпу 62 з археалагічнага комплекса Пруднікі

малюнак М. А. Плавінскага

Шэсць наканечнікаў знойдзены на гарадзішчы Муравельнік ў Ваўкавыску, у пластах канца X – пачатку XI ст. Даўжыня іх 98–114 мм, даўжыня пяра – 74–97 мм, шырыня пяра – 14–17 мм. [14, с. 108]. У 150 км на поўнач ад гарадзішча Муравельнік, падчас раскопак 1969 г. пад кіраўніцтвам Я. Г. Звяругі быў даследаваны курган, які знаходзіўся на тэрыторыі прыватнага хутара. У кургане выяўлена пахаванне па абраду інгумацыі. У культурным пласце пад насыпам былі знойдзены некалькі жалезных прадметаў, сярод якіх серп X–XI стст., 2 двушыпныя стралы тыпу 2 X–XI стст. і 1 ланцэтападобны наканечнік тыпу 62: 2 [15, с. 212].

У матэрыялах, апублікаваных Ф. Д. Гурэвіч, налічваецца 7 наканечнікаў з Навагрудка. 5 з іх знойдзены на тэрыторыі Малога Замка. Даўжыня – 9–11 см [16, с. 169].

Некалькі стрэл знойдзены на поўдні сучаснай тэрыторыі Беларусі.

Два наканечнікі паходзяць з культурнага пласта гарадзішча Кімбараўка ў Мазыры. Адзін знойдзены ў 1982 г. у раскопе 2, у запаўненні пабудовы 3 у паўднёва-заходняй частцы гарадзішча, побач з валам. Таксама ў запаўненні пабудовы – фрагменты ляпной і кругавой керамікі, гліняныя і шыферныя прасліцы, наканечнік стралы тыпу 41:1 [17, с. 388–389]. Ланцэтападобны наканечнік пагнут па мяжы пяра і шыйкі, верагодна, у выніку яго непасрэднага выкарыстання. Другі наканечнік знойдзены ў 2005 г. у раскопе 5, у запаўненні пабудовы 4 ля падножжа вала. У комплексе з ім – фрагменты ляпной і кругавой керамікі [18, с. 11].

Адзін наканечнік паходзіць з раскопак А. В. Іова на гарадзішчы Франопаль Брэсцкага р-на [19, мал. 1:6].

**Тып 75. Ланцэтападобныя трохкутнага сячэння** (10 экз., Мал. 4. 1–5).

Вылучаюцца два варыянты тыпу: 1-ы – без валіка на шыйке, 2-і з валікам [7, с. 78–79].




*Мал. 4.* Ланцэтападобныя наканечнікі стрэл тыпаў 75 (1–5) і 77 (6–8)

1-4 – археалагічны комплекс Лукомль [2, мал, 14:3: 11–14], 5 – гарадзішча Кімбараўка, 6–7 – археалагічны комплекс Пруднікі, 8 – гарадзішча Лукомль

Да першага варыянту адносяцца 7 экзэмпляраў. Тры з іх паходзяць з гарадзішча Лукомль, усе тры дэфармаваныя (Мал. 4: 1–3). Адзін наканечнік знойдзены ў Полацку, на селішчы каля Чырвонага маста, так званага «селішча на Палаце», раннія пласты якога датуюцца X ст. [20, с. 70]. Акрамя ляпной керамікі, у пластах селішча, цікавасць выклікае наканечнік стралы тыпу 46 па А. Ф. Мядзведзеву. Так жа 3 экзэмпляры знойдзены ў адной кропцы на гарадзішчы Пруднікі [21, мал. 38: 2, 4]. Усе тры надзвычай дрэннай захаванасці, чарашкі наканечнікаў не захаваліся. Даўжыня іх пяра – 71, 81, 92 мм, шырыня – 8, 7, 9 мм адпаведна.

Тры наканечнікі маюць валік на шыйке. Адзін з іх знойдзены на гарадзішчы ў Лукомлі, лязо яго пагнута ў выніку ўдару аб цвёрдую паверхню.

Адзін наканечнік паходзіць з пабудовы 2, раскопу 1 1982 г. на гарадзішчы Кімбараўка (Мал. 4: 5). Пабудова размяшчалася побач з частаколам ля падножжа вала. Гэтак жа ў запаўненні пабудовы выяўлены 175 ляпных і 115 кругавых фрагментаў керамікі, палова дырхема (манетны двор аль-Мухамедыя, 798–799 гг.), падкովападобная фібула і інш. [18, с. 10]. Вастрыё стралы моцна пагнута, верагодна, у выніку ўдару аб цвёрдую паверхню. Наканечнік быў падвергнуты металаграфічнаму аналізу М. Ф. Гурыным. У выніку аналізу было ўстаноўлена, што страла зроблена з некалькіх слаёў нізкавуглеродзістай сталі і жалеза [4, с. 100, мал. 1: 8].

Адзін наканечнік знойдзены на гарадзішчы Лукомль. Адзін на гарадзішчы Кульбачына [3, с. 195]. Яго даўжыня – 75 мм, даўжыня галоўкі – 58 мм, шырыня галоўкі – 6 мм.

**Тып 77. Ланцэтападобныя квадратнага сячэння** (8 экз., Мал. 4: 6–8).

А. Ф. Мядзведзеў вылучыў тры варыянты тыпу: 1 – з доўгай баявой галоўкай і кароткім чарашком, 2 – без ўпора для чарашка, 3 – з доўгім чарашком, позняя разнавіднасць [7, с. 79]. На тэрыторыі Беларусі знойдзены 8 стрэл тыпу 77, якія адносяцца да першага варыянту.

1 варыянт паходзіць з пабудовы 1, раскопу 1 1982 г. на гарадзішчы Кімбараўка. Пабудова размяшчалася побач з частаколам ля падножжа вала [18, с. 388]. Наканечнік дэфармаваны ў выніку прымянення.

Яшчэ адзін экземпляр знойдзены на тэрыторыі дзяцінца Гомеля ў запаўненні рва № 1. Сярод іншых знаходак выяўлена некалькі наканечнікаў стрэл X–XII стст., а таксама ранне-кругавая кераміка X–XI стст. Ланцетападобная страла моцна дэфармаваная, мае пагнутасць, а таксама аблом ляза, хутчэй за ўсё, у выніку яго выкарыстання.

3 стралы тыпу 77: 1, знойдзеныя пры раскопках на Малым Замку ў Наваградку, згадваюцца ў публікацыях Ф. Д. Гурэвіч [16, с. 170].

У напластаванні гарадзішча Пруднікі знойдзены 2 наканечнікі, абодва маюць свае асаблівасці (Мал. 4: 6, 7). Даўжыня першага – 132 мм, што значна больш, чым звычайна. Даўжыня другога – 115 мм, пры гэтым чарашок яго – 37 мм, што адпавядае наканечнікам трэцяга варыянту па А. Ф. Мядзведзеву. Але, улічваючы шэраг абставінаў, гэты наканечнік аднясем таксама да першага, ранняга варыянту тыпу 77.

1 экземпляр знойдзены на гарадзішчы Лукомль [2, мал. 14:15].

**Тып 78. Ланцэтападобныя рамбічнага сячэння** (2 экз.)

Па прапорцыях пяра А. Ф. Мядзведзеў вылучыў два варыянты тыпу [7, с. 80]. На тэрыторыі Беларусі знойдзены два экземпляры, якія адносяцца да першай, ранняй разнавіднасці. Адзін з іх знойдзены ў Мінску, у праслойцы нанаснога рачнога пяску [22, мал. 27:19]. Другі – на паселішчы ля Чырвонага маста ў Полацку [20, с. 70].

Існуе мноства меркаванняў аб паходжанні і шляхах распаўсюджвання тых ці іншых варыянтаў ланцэтападобных стрэл. Праца па іх абагульненню была зробленая С. Ю. Каінавым [5, с. 49–62]. На дадзены момант можна сцвярджаць, што большасць ланцэтападобных наканечнікаў стрэл IX – пачатку XI ст., знойдзеных на тэрыторыі Старажытнай Русі, маюць паўночнаеўрапейскія карані.

Тыпалогія ланцэтападобных наканечнікаў са Швецыі была распрацавана Э. Вегрэ і дапоўненая П. Ліндбамам [23]. Імі былі вылучаны наступныя тыпы:

**Тып А.** Ланцэтападобныя плоскія (адпавядае тыпу 62 па А. Ф. Мядзведзеву).

Дзеляцца на два варыянты – А1 – з вузкім пяром і шыйкай карацей пяра і А2 – з шыйкай даўжэй пяра. Варыянт А1 дзеліцца на два падварыянты – AS1 – вузкі і лёгкі і AJ1 – шырокі і цяжкі. Наканечнікі AS1 выкарыстоўваліся ў баявых умовах, AJ1, гэтак жа як і А2 – на паляванні.

З усіх наканечнікаў тыпу А з тэрыторыі Беларусі, толькі адзін экземпляр з Пруднікаў можна сапраўды аднесці да падтыпаў AJ1. Адна страла з Навагрудка і адна з Лукомля адносіцца да тыпу А2 [16, мал. 65: 10; 5, мал. 14–3: 16]. Усе астатнія плоскія ланцэты адносяцца да падтыпаў AJ1.

**Тып D.** ланцэтападобныя гранёныя (адпавядае тыпам 75, 77, 78 па А. Ф. Мядзведзеву).

Тып выключна баявых наканечнікаў. Дзеліцца на варыянты: D1 – гранёныя трохгранныя і D2 –гранёныя квадратныя.

Існуе адносна ўстоялівая храналогія тыпаў разглядаемых наканечнікаў стрэл. А. Ф. Мядзведзеў датаваў тып 62 – IX–X стст., тып 75–X ст., 77:1 – X–XI стст., 78:1 – IX–X стст. [7, с. 73–74, 78–80].

Знаходкі са Скандынавіі датуюцца наступным чынам: А1 – IX–X стст., А2, D1 – X – п.п. XI ст., D2 –др.п. X – п.п. XI ст. [23].

На тэрыторыі Старажытнай Русі ланцэтападобныя наканечнікі з’яўляюцца ў IX ст. і шырока распаўсюджваюцца ў X ст., зрэдку сустракаюцца ў XI ст. Пазнейшыя экземпляры ланцэтападобных стрэл адрозніваюцца скарочаным пяром і падоўжаным чарашком, што звязана з прыстасаваннем іх для стральбы са складанага лука [5, с. 55]. Сярод знаходак з тэрыторыі Беларусі класічных пазнейшых ланцэтаў няма.




*Мал. 5.* Распаўсюджанне ланцэтападобных стрэл на тэрыторыі Беларусі

1 – Віцебск, Ніжні Замак, 2 – Полацк, 3 – археалагічны комплекс Пруднікі, 4 – гарадзішча Svіла-1, 5 – археалагічны комплекс Лукомль, 6 – гарадзішча Кастрыца, 7 – гарадзішча Кульбачына, 8 – Навагрудак, 9 – Ваўкавыск, гарадзішча Муравельнік, 10 – гарадзішча Франопаль, 11 – гарадзішча Кімбараўка, 12 – Гомель, 13 – Мінск, Замчышча

У адпаведнасці з падлікамі С. Ю. Каінава на тэрыторыі Старажытнай Русі знойдзена 360 ланцэтападобных наканечнікаў ў 52 пунктах [5, с. 59]. З тэрыторыі Беларусі ў каталог С. Ю. Каінава трапіла каля 70 адзінак з 7 пунктаў. На дадзены момант можна казаць пра 99 стрэл з 14 пунктаў (безумоўна, улічваючы некаторыя неапублікаваныя матэрыялы, а таксама прадметы, якія ёсць у калекцыях «чорных археолагаў», колькасць гэтая ўзрасце). Улічваючы тапаграфію знаходак, заўважым, што шырокага распаўсюджвання ланцэтападобныя стрэлы на тэрыторыі Беларусі не мелі (Мал. 5).

Звяртаючыся да тапаграфіі, можна адзначыць, што знаходкі ланцэтападобных стрэл на тэрыторыі Беларусі маркіруюць асноўныя ваенна-гандлёвыя шляхі X–XI стст.

Можна вылучыць два рэгіёны, дзе знойдзена больш за ўсё ланцэтападобных наканечнікаў – Беларускае Падзвінне і Панямонне.

З 61 наканечніка з Падзвіння, 52 паходзяць з тэрыторыі ўсяго двух археалагічных комплексаў – Лукомль і Пруднікі.

Археалагічны комплекс Пруднікі Міёрскага р-на Віцебскай вобласці знаходзіцца на беларуска-латвійскім памежжы на левым беразе р. Вята за 1,5 км ад Заходняй Дзвіны. Комплекс складаецца з гарадзішча, якое функцыянавала з V па XVII стст., і селішча V – пач. XI ст.

Агульная колькасць знойдзеных у Прудніках ланцэтападобных стрэл – 35 адзінак. З экзэмпляраў з гарадзішча, месца знаходкі якіх дакладна зафіксавана, 12 наканечнікаў паходзяць з раскопаў, закранутых канструкцыямі вала на паўночна-ўсходнім схіле гарадзішча. 5 стрэл знойдзены ў раскопе 1983 г., у пласце са слядамі моцнага пажару, там, дзе магчыма знаходзіліся жылыя пабудовы. 8 наканечнікаў знойдзены ў пластах селішча.

26 стрэл (70 % калекцыі) маюць сляды непасрэднага выкарыстання, судакранання з цвёрдай паверхняй. На некалькіх маюцца сляды знаходжання ў агні. Пры гэтым, з 8 ланцэтападобных наканечнікаў, знойдзеных на селішчы, пяро і чарашок моцна дэфармаваны ў 4 адзінкі. З 11 стрэл, знойдзеных у раскопах, закранутых канструкцыямі вала, дэфармавана 9 экземпляраў. Улічваючы планіграфію і марфалогію артэфактаў, можна меркаваць, што абсалютная большасць ланцэтападобных стрэл трапіла ў культурны пласт гарадзішча ў выніку ваеннага нападу.

Па знешніх прыкметах (прысутнасць побач з плоскімі стрэламі класічных прапорцый гранёных наканечнікаў), можна аднесці калекцыю да др.п. X – пач. XI ст.

У X–XI стст. у рэгіёне Браслаўскага Паазер’я адбываюцца значныя змены. У курганах КСПДК з’яўляюцца пахаванні паводле абраду інгумацыі са зброяй старажытнарускіх і паўночнаеўрапейскіх тыпаў. Звязаныя гэтыя змены з прасоўваннем Полацкага княства ў рэгіён захаду Беларускага Падзвіння. У гэты ж час, у к. X – пач. XI ст., на гарадзішчы і паселішчы Пруднікі ў балцкія традыцыі матэрыяльнай культуры пранікаюць традыцыі старажытнарускія. Знаходкі зброі далёкага бою сведчаць, што на працягу стагоддзяў гарадзішча Пруднікі падвяргалася нападам неаднаразова. Вялікіх калекцый неланцэтападобных стрэл др. п. X – п. п. XI ст. не прасочваецца. Можна канстатаваць, што прыкладна ў той жа час, калі старажытнарускія традыцыі пранікаюць у матэрыяльную культуру Пруднікаў, у др. п. X – п. п. XI ст., на гарадзішча здзяйсняе напад дружына, у якой прысутнічалі выхадцы з Паўночнай Еўропы.

Ланцэтападобныя стрэлы з Лукомля апублікаваны І. І. Ерамеевым і Г. В. Штыхавым, таму ў дадзенай працы не будзем падрабязна на іх спыняцца. У пластах гарадзішча выразна прасочваецца разбуральны пажар у канцы X ст., які стаў вынікам ваеннага нападу. З прычыны гэтага нападу ланцэтападобныя стрэлы патрапілі ў культурны пласт комплексу. 14 з 16 стрэл наканечнікаў значна дэфармаваны. Іншага ўзбраення ў матэрыялах гарадзішча не прасочваецца.

Ланцэтападобныя наканечнікі ў Верхнім Панямонні выяўлены ў Ваўкавыску і Навагрудку – найбуйнейшых цэнтрах рэгіёну, а таксама на гарадзішчы Кульбачына.

Гарадзішча Кульбачына Шчучынскага р-на Гродзенскай вобласці было заснавана ў X ст. як крэпасць – апорны пункт каланізацыі правабярэжжа Нёмана. 13 ланцэтападобных наканечнікаў стрэл, 2 наканечнікі копій тыпу Е па тыпалогіі Я. Петэрсена, дзясятак іншых наканечнікаў стрэл з ромбічных пяром X–XI стст. сведчаць аб той ваеннай ролі, якую адыгрывала паселішча, а таксама аб прысутнасці тут носьбітаў паўночнаеўрапейскіх ваенных традыцый.

Адзінкавыя знаходкі ланцэтападобных наканечнікаў на поўдні сучаснай тэрыторыі Беларусі.

Гарадзішча Франопаль знаходзіцца ў Брэсцкім р-не на р. Рыта. У дыяметры плошча гарадзішча складае 30 м, яно мае круглую форму, акружана валам вышынёй ад 1,5 да 2,5 м. Акрамя керамікі, у пластах знойдзена значная колькасць прадметаў ўзбраення: наканечнікі дзід, сякеры, наканечнік ножан мяча мяжы X–XI стст. Гарадзішча ўзнікла ў 950–1000 гг. і, мяркуючы па маштабных слядах пажарышча, было разбурана ў выніку аднаго нападу на мяжы X–XI стст. [19, с. 80–81]. Таксама ў пластах гарадзішча прысутнічаюць розныя наканечнікі стрэл X–XI стст.

4 наканечнікі паходзяць з запаўненняў пабудоў гарадзішча Кімбараўка ў г. Мазыры. Г. М. Залашка і В. У. Булкін, якія даследавалі гарадзішча, датавалі яго пласты VIII – пач. XI ст. [18, с. 389]. Тры ланцэтападобныя наканечнікі моцна дэфармаваны ў выніку іх непасрэднага выкарыстання. Звяртае на сябе ўвагу прысутнасць у пласце шэрагу наканечнікаў стрэл розных тыпаў X–XI стст. Паселішча было буйным гандлёва-рамесным цэнтрам, у жыцці якога прымалі ўдзел выхадцы з Паўночнай Еўропы [18, с. 12]. Прысутнасць у запаўненні пабудоў, якія знаходзяцца побач з валам, вялікай колькасці наканечнікаў стрэл, частка з якіх моцна дэфармавана, сведчыць аб магчымым нападзе на гарадзішча.

Звяртае на сябе ўвагу склад калекцый наканечнікаў стрэл з помнікаў, на якіх знойдзены цікавыя нам ланцетападобныя стрэлы. Так, у раскопах Гомеля і Франопаля, дзе ланцэтападобныя экземпляры адзінкавыя, знойдзена больш за дзесятак ромбападобных стрэл к. X – пач. XI ст. У Кімбараўцы іх суадносіны прыкладна роўныя. У напластаваннях гарадзішча Муравельнік ў Ваўкавыску і Малога Замка ў Наваградку колькасць ланцэтападобных стрэл не перавышае 15% ад агульнай колькасці наканечнікаў X–XI стст. На гарадзішчы Кульбачына ланцэтападобных стрэл на некалькі адзінак больш, чым іншых сінхронных наканечнікаў. Усе прыведзеныя вышэй факты яшчэ раз сведчаць аб тым, што шырокага распаўсюджвання ў разглядаемым рэгіёне цікавячыя нас тыпы стрэл не мелі. Верагодна, большасць ланцэтападобных стрэл патрапілі ў культурныя напластаванні помнікаў на тэрыторыі Беларусі з прычыны падзей др. п. X – пач. XI ст., звязанымі са станаўленнем межаў старажытнарускай дзяржавы. Можна меркаваць, што ў гэтых падзеях прымалі ўдзел выхадцы з Паўночнай Еўропы ці носьбіты паўночнаеўрапейскіх ваенных традыцый.

Факт знаходкі ў Беларускім Падзвінні большасці наяўных у нашым распараджэнні ланцэтападобных стрэл з тэрыторыі Беларусі не дзіўны. У сярэдзіне X – пач. XI ст. пачынаецца актыўнае выкарыстанне водных артэрый Заходнедзвінскага шляху. Гэты перыяд звязаны з узмацненнем у рэгіёне ролі Полацка. Наяўнасць ланцэтападобных наканечнікаў стрэл, а таксама іншых прадметаў узбраення паўночнаеўрапейскага паходжання, сведчаць аб удзеле ў гэтым працэсе выхадцаў з Паўночнай Еўропы. Аднак нешматлікасць знаходак прадметаў узбраення блізкага бою паўночнаеўрапейскіх тыпаў дазваляе меркаваць, што тэрыторыя Полацкай зямлі з’яўлялася адным з рэгіёнаў Усходняй Еўропы, слаба насычаным ў X–XI стст. зброяй скандынаўскага паходжання [24, с. 218]. Прычыны гэтай з’явы варта, верагодна, шукаць у асаблівасцях гістарычнага развіцця рэгіёну. На фоне адзінкавых знаходак ланцэтападобных наканечнікаў стрэл у комплексах з вялікай колькасцю іншых стрэл X–XI стст., вылучаюцца археалагічныя комплексы Лукомль і Пруднікі. Асабліва цікавыя Пруднікі, дзе знойдзена траціна ўсіх вядомых на тэрыторыі Беларусі ланцэтападобных

наканечнікаў. Верагодна, наканечнікі гэтыя патрапілі ў напластаванні помніка ў выніку нападу, які меў месца ў перыяд прасоўвання інтарэсаў Полацкага княства ў рэгіён Браслаўскага Паазер'я. Варта адзначыць, што на гарадзішчы «Замак», што знаходзіцца ў Дрысвятах (Браслаўскае Паазер'е), таксама маюцца сляды значнага разбурэння к. Х – пач. ХІ ст. Аднак у напластаваннях помніка, якія змяшчаюць тры дзесяткі наканечнікаў гэтага перыяду, не знойдзена ніводнай ланцэтападобнай стралы [25, с. 301].

Такім чынам, мяркуючы па наяўных матэрыялах, можна меркаваць, што мясцовыя ваяры не выкарыстоўвалі шырока ланцэтападобныя наканечнікі. Позніх формаў разглядаемых тыпаў стрэл, з доўгім чарашком і скарочаным пяром, у помніках рэгіёну не адзначана. Няма падстаў, каб казаць аб мясцовай вытворчасці ланцэтападобных стрэл. Гібрыдным тыпам можна лічыць ланцэтападобныя наканечнікі тыпу 78, якія сустракаюцца на ўсходнееўрапейскіх помніках, аднак, адсутнічаюць у Скандынавіі (на тэрыторыі Беларусі выяўлена 2 падобныя наканечнікі). Магчыма, найпознімі гібрыдамі з'яўляюцца некаторыя стрэлы тыпу 63 з доўгімі чарашкамі, якія сустракаюцца ў вялікай колькасці ў пластах XI–XIII стст. (аднак гэта тэма для іншага даследавання). Абсалютная большасць ланцэтападобных стрэл з тэрыторыі Беларусі патрапілі ў напластаванні помнікаў у выніку іх непасрэднага прымянення, з прычыны ваенных нападаў, звязаных з падзеямі Х – пач. ХІ ст.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Шадыро В. И. Средневековые наконечники стрел лука и арбалета из поселения у д. Прудники // ГАЗ. 1994. № 4.

2. Еремеев И. И. Древний Лукомль. Лепная керамика и раннесредневековый культурный слой // Acta archeologica Albarutenica. 2007. Vol. 1.

3. Пивоварчик С. А. Вооружение и снаряжение всадника из раскопок понеманских городищ (X–XIII вв.). // ГАЗ. 1994. № 3.

4. Гурин М. Ф. Кузнечное ремесло Полоцкой земли. IX–XIII вв. Минск: Наука и техника, 1987.

5. Каинов С. Ю. Ланцетовидные наконечники стрел из раскопок Гнёздова // Раннесредневековые древности Северной Руси и её соседей. 1999.

6. Дернович С. Д. Исследования на городище у д. Масковичи Браславского района Витебской области в 2001 г. // МАБ. 2003. № 6.

7. Медведев А. Ф. Ручное метательное оружие (лук и стрелы, самострел) VIII–XIV вв. Москва: Наука, 1966. – 184 с.

8. Штыхов Г. В. Древний Полоцк (IX–XIII вв.). – Минск: Наука и техника, 1975.

9. Штыхов Г. В. Города Полоцкой земли (IX–XIII вв.). Минск: Наука и технка, 1978.

10. Іоў А. В. Кімбараўка // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. Т. 2. Л-Я. Мінск, 2001.

11. Пивоварчик С. А. Отчет о проведении работ на городищах Белорусского Понемонья в 1990 г. // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. Арх. № 1247.

12. Штыхов Г. В. Отчет об археологических исследованиях в Витебской области и Логойске в 1965 г. // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. Арх. № 295.

13. Мітрафанаў А. Р. Археалагічны помнік расказвае // ПГКБ. 1975. № 4.

14. Зверуго Я. Г. Древний Волковыск (X–XIV вв.). Минск: Наука и техника, 1975.

15. Зверуга Я. Г. Раскопкі курганоў у вярхоўях Росі і Зэльвянкі // ГАЗ. Мінск.№ 22.

16. Гурэвіч Ф. Д. Летапісны Новгородок (Старажытнарускі Навградак). Санкт-Пецярбург: Агенство «РДК принт», 2003.

17. Залашко Г. М. Городище Кимбаровка // АО 1983 года. Москва, 1985.

18. Колосовский Ю. В. Средневековый город // Мазыр: гісторыя і сучаснасць. Мазыр, 2005.

19. Кулаков В. И. Наконечники ножен меча из кургана 174 могильника Кауп и с городища Франополь // КСИА. Москва. 2001. Вып. 211.

20. Плавінскі М. А. Ляпная кераміка полацкага селішча // ГАЗ. Мінск. 2006. № 21.

21. Шадыро В. И. Отчет о раскопках селища близ д. Прудники Миорского р-на Витебской обл. в 1997 г. // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. Арх. № 1717.

22. Заяц Ю. А. Оборонительные сооружения Менска XI–XIII вв. Минск: Издатель В.Н. Милютин, 1996.

23. Wegraeus E. Die Pfeilspitzen von Birka // Birka II: 2 Systematische Analysen der Gräberfunde. Stockholm, 1986.

24. Плавинский Н. А. Оружие североевропейских типов в комплексе вооружения Полоцкой земли X–XI вв. // XVI конференция по изучению Скандинавских стран и Финляндии: в 2 ч. Ч. I. Москва–Архангельск, 2008.

25. Семенчук Г. Н. Раннесредневековый археологический комплекс Дрисвяты // Lietuvos archeologija. 2001. T. 21.